**Список цитируемых источников**

1. Праславянский язык [Электронный ресурс] // Славяне. — Режим доступа: http:// http://slawianie.narod.ru/str/jazyk /prasl.html . — Дата доступа: 14.03.2018.
2. Настолько ли похожи болгарские и русские слова [Электронный ресурс] // Профессиональный форум о Болгарии. — Режим доступа: https://www.bglife.ru/entries/2112/ . — Дата доступа: 12.03.2018.
3. Болгарский язык. Интересные факты о болгарском и русском языках [Электронный ресурс] // Бургас. — Режим доступа: http:// bourgas.ru/bolgarskiy-yazyik-interesnyie-faktyi/ . — Дата доступа: 12.03.2018.

УДК 821.161.3.09

**А. У. Шлег**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

# ФІЛАСАФІЧНАСЦЬ ВЯНКА САНЕТАЎ «АПАКАЛІПСІС ДУШЫ» ЗМІТРАКА МАРОЗАВА

**Уводзіны.** Філасафічнасць сучаснай беларускай літаратуры — адна з важнейшых стылявых адзнак, якая сведчыць пра высокі ўзровень яе развіцця, імкненне пазнаць акаляючы свет, агульначалавечую і нацыянальную сімволіку, праблемы ўзаемаадносін людзей і адносін чалавека да прыроды, грамадства, духоўнага жыцця.

**Асноўная частка.** Філасафічнасць — творчая манера мастака — заключаецца ў распрацоўцы пытанняў светапогляду [5]. Жаданне Змітрака Марозава пазнаць і адлюстраваць шматгранны свет выяўляецца ў выбары ім формы падачы зместу. Гэта вянок вянкоў санетаў. Паэт з’яўляецца стваральнікам першага ў беларускай літаратуры вянка вянкоў санетаў [4, с. 436]. Вянок вянкоў санетаў — самая складаная, вычварная санетная структура. Ён складаецца з пятнаццаці вянкоў санетаў. Апошні, пятнаццаты, вянок санетаў уключае ў сябе магістралы ўсіх папярэдніх. «Апакаліпсіс душы» высакародна прысвечаны рана памерламу беларускаму паэту А. Сербантовічу, аўтару чатырох вянкоў санетаў. Каханне, грамадска-палітычныя праблемы, мінулае і сучаснае, матэрыяльнае і духоўнае, уласныя перажыванні і думкі — гэтае і многае іншае паэт увасобіў у «Апакаліпсісе душы».

Стагоддзе ў муках грэшнікаў канае —
Няўжо фінал біблейскі надышоў? [1, с. 230].

Паводле «Навейшага філасофскага слоўніка», апакаліпсіс (грэч. адкрыццё.) абазначае перыяд часу або стан грамадства, калі існаванню самога чалавека пагражаюць разбуральныя, смяротныя сілы (зброя масавага знішчэння, экалагічныя катастрофы, няўхільныя эпідэміі). Традыцыйна маецца на ўвазе вобраз чатырох апакаліптычных коннікаў [2, с. 127].

Апакаліптычныя коннікі — сімвал катастроф, якія спасцігнуць свет, малюнак самых цяжкіх, пераходных эпох. Першы коннік (на белым кані) — Чума, другі (на рудым кані) — Вайна, трэці коннік (на вараным кані) — Голад, апошні коннік (на бледным, як памерлы чалавек, кані) — Мор (грэч. смерць). Вобразы гэтых коннікаў З. Марозаў уводзіць у свой твор, увасабляючы ў іх чалавечыя нягоды [3, с. 43].

Чарнобыльская аварыя ў вянку вянкоў санетаў З. Марозава паўстае як першы коннік — Чума. Тое, што пакідае ён пасля сябе, — атамная чума, нябачная атрута, эпідэмія, якая знішчае «лясныя вёскі», «верасовыя ўзлессі», пчол, буслоў, рамонкавыя палі, — усё, з чым звязана адчуванне шчасця ў лірычнага героя. Наступствы гэтай аварыі адчувальныя і сёння.

І ўжо Чарнобыль родны край лінчуе,
Гняздзіцца ў сэрцах нечуваны страх.
Клякоча над пустым гняздом бусліха,
А над калекам б’ецца парадзіха.
І труцяць нас кіслотныя дажджы… [1, с. 213].

З вобразам першага конніка паэт звязвае СНІД, гэтую чуму XXI стагоддзя:

І вось ўжо вісіць над чалавекам,
Як меч дамоклаў, СНІД — хвароба веку…
Жыву, не пазбягаючы нягод [1, с. 228].

Другі коннік — Вайна, і ён чыніць суд іменем самога Бога. Конь яго — чырвонага колеру (у некаторых перакладах — «палымяна»-чырвонага або рудога). Гэты колер, як і вялікі меч у руках конніка, азначаюць кроў, пралітую на полі бою.

Калі таптаў Еўропу Гітлер-кат,
Уратаваў народы наш салдат,
Мы ўсе нягоды з ім перамалолі [1, с. 263].

І калі ўнукі перасталі асэнсоўваць тое, якой цаной заваявана іх спакойнае, шчаслівае жыццё, то чырвоны коннік — Вайна — можа зноў з’явіцца.

Экалагічны крызіс ахапіў літаральна ўсе краіны свету. Ён стаў вынікам спажывецкай і драпежніцкай у адносінах да прыроды тэхнагеннай дзейнасці чалавечай цывілізацыі. Гэтая глабальная праблема асацыіруецца з вобразам трэцяга конніка — Голадам.

© Шлег А. У., 2018



Рэпазіторый БарДУ

Здаецца, мы не пасынкі ў прыроды,
Але чаму ёй робім столькі шкоды?
Бяздушша атруціла пачуццё? [1, с. 176].

Голад свабоды, на думку паэта, пастаянна пераследуе творцаў, іх паэтычная «жар-птушка» гіне ад цэнзараў-«аслоў».

Апошні коннік — Мор, або Смерць. Смерць, забыццё, сцвярджае З. Марозаў, пераследуе тых, хто не хоча шанаваць, зберагаць памяць пра ахвяры вайны.

Паэт разважае аб сэнсе чалавечага жыцця, выкарыстоўваючы элементы народнай парэміялогіі: «Жыццё пражыць — не поле перайсці». Адны дарэмна трацяць свае гады, а іншыя працуюць дзеля светлай будучыні нашчадкаў. З іншага боку, тое, што сёння здаецца падзеяй усяго жыцця, заўтра можа страціць сваю значнасць, нават і не ўспомніцца. У «Апакаліпсісе душы» аўтар таксама шырока выкарыстоўвае біблейскую і антычную міфалогію і сімволіку. Згадваюцца такія міфічныя істоты, як Пегас і Жар-птушка; Смерць у творы паўстае ў выглядзе бабулі. Прэцэдэнтныя вобразы спрыяюць больш дасканаламу выяўленню аўтарскіх інтэнцый:

Каб меў такія чары, як Сварог,
Уваскрасіць хацеў бы ўсіх забітых [1, с. 223].

**Заключэнне.** Філасафічнасць вянка вянкоў санетаў З. Марозава «Апакаліпсіс душы» змястоўна выяўляецца ў абсягу і маштабах пытанняў, якія ўздымае аўтар, а фармальна — у звароце да біблейскіх сімвалаў, вобразаў народнай міфалогіі, якія стымулююць да разваг над праблемамі сучаснага жыцця, іх ацэнкі, сувязі з будучым лёсам чалавека і свету.

**Спіс цытуемых крыніц**


1. *Марозаў, З.* Вачыма сэрца : вершы, санеты, вянкі санетаў, вянок вянкоў санетаў / З. Марозаў ; прадм. В. Рагойшы. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2014. — 284 с.
2. Новейший философский словарь / А. А. Грицанов. — Минск : В. М. Скакун, 1998. — 896 с.
3. *Рагойша, В.* Паэтычны слоўнік / В. Рагойша. — 3-е выд., дапрац. і дап. — Мінск : Беларус. навука, 2004. — 576 с.
4. Толковый словарь русского языка : в 4 т. / под ред. Д. Н. Ушакова. — М. : Гос. изд-во иностр. и нац. слов., 1940. — Т. 1. — 1935 ; Т. 2. — 1938 ; Т. 3. — 1939 ; Т. 4. С—Ящурный. — 1082 с.
5. Философский энциклопедический словарь / ред.-сост.: Е. Ф. Губский [и др.]. — М. : Инфра-М., 2003. — 576 с.


УДК 821.161.3.09Жвалевский:821.161.3.09

**П. В. Щерба, К. В. Каминская**
*Государственное учреждение образования «Гимназия № 2 г. Бреста», Брест*

## ФОЛЬКЛОРНЫЕ И ЛИТЕРАТУРНЫЕ ТРАДИЦИИ В ПРОЗЕ А. В. ЖВАЛЕВСКОГО И Е. Б. ПАСТЕРНАК («ОХОТА НА ВАСИЛИСКА», «ГИМНАЗИЯ № 13»)

**Введение.** Литература Беларуси начала XXI века осмысливает проблемы современного общества, уделяя особое внимание подрастающему поколению. Тенденции развития современного литературного процесса помогают установить закономерности влияния социальных явлений на эволюцию жанровых форм во взаимосвязи традиции и новаторства. Работа посвящена изучению литературных и фольклорных традиций в школьной прозе Андрея Валентиновича Жвалевского и Евгении Борисовны Пастернак — русскоязычных писателей Беларуси. О значимости темы исследования свидетельствует тот факт, что ведутся активные дискуссии о проблемах повседневной жизни современных школьников, обсуждается их моральный облик. Зачастую у «отцов» и «детей» возникают проблемы в общении между собой: многие родители не знают, что происходит в жизни их ребенка, что его окружает. В современном обществе существует большое количество легкодоступных развлечений, которые несут вред психическому и физическому здоровью, разрушают жизнь подростка. В этом контексте связь с фольклорным и литературным наследием в школьной прозе приобретает особую актуальность.

**Основная часть.** Влияние устного народного творчества и литературной традиции на современную русскоязычную прозу Беларуси прослеживается в школьных повестях А. В. Жвалевского и Е. Б. Пастернак «Охота на василиска» и «Гимназия № 13». Детальное рассмотрение указанной проблемы предполагает использование описательного метода (представление изучаемых понятий («школьная повесть», «повседневность») в теоретическом аспекте) с такими его приёмами, как наблюдение, классификация, обобщение, интерпретация.

Не вызывает сомнений то, что литературная традиция проявляет себя через выбор жанровой формы. Несмотря на то, что сам жанр школьной повести начинает формироваться после второго совещания по детской литературе (1936), когда С. Маршак заявил о необходимости создания произведений, предполагающих правдивое изображение повседневной школьной жизни, его истоки кроются в произведениях XIX — начала XX века (например, в «Очерках бурсы» Н. Г. Помяловского и «Республике ШКИД» Г. Белых и А. Еремеева).

© Щерба П. В., Каминская К. В., 2018

Репозиторий БарГУ